# Гістарычная граматыка беларускай мовы як лінгвістычная дысцыпліна

1 Мэты і задачы курса, яго практычнае і выхаваўчае значэнне.

2 Асноўныя метады вывучэння гістарычнай граматыкі.

3 Сувязь дысцыпліны «Гісторыя беларускай мовы» з іншымі навукамі.

4 Асноўныя крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы.

# 1 Мэты і задачы курса, яго практычнае і выхаваўчае значэнне

Гістарычныя законы развіцця беларускай мовы тлумачаць яе генетычную роднасць як з блізкароднаснымі ўсходнеславянскімі (рускай і ўкраінскай), так і з іншымі славянскімі (заходнеславянскімі і паўднёваславянскімі) мовамі.

# Курс гісторыі беларускай мовы

- складаецца з 2 частак: гістарычная граматыка беларускай мовы і гісторыя беларускай літаратурнай мовы.

**Гістарычная граматыка** вывучае агульнанародную мову па-за сувяззю з пэўнай стылістычнай арганізацыяй мовы, у яе вусным афармленні. Пытанні аб літаратурнай мове ў розныя перыяды яе гісторыі, аб яе адносінах да агульнанароднай мовы, аб выкарыстанні мовы ў розных стылях, у пісьмовым яе афармленні адносяцца да **гісторыі беларускай літаратурнай мовы**.

# Гістарычная граматыка беларускай мовы

– навука аб развіцці беларускай мовы, гісторыі развіцця яе фанетычнай, марфалагічнай і сінтаксічнай сістэм па іх унутраных законах; навука, якая тлумачыць як на працягу доўгага часу змяняліся гукі і формы беларускай мовы, яе сінтаксічная структура і лексічны склад.

# гістарычная граматыка беларускай мовы

складаецца з раздзелаў:

- гістарычная фанетыка,
- гістарычная лексікалогія,
- гістарычная марфалогія,
- гістарычны сінтаксіс.

- Гістарычная граматыка беларускай мовы з’яўляецца састаўной часткай гістарычнай граматыкі ўсходнеславянскіх моў, якая, у сваю чаргу, стала прамежкавым звяном паміж параўнальнай граматыкай славянскіх моў і асобнай усходнеславянскай мовай (беларускай). Гэтыя сувязі яскрава выяўляюцца ў метадах вывучэння гістарычнай граматыкі.

# 2 Асноўныя метады вывучэння гістарычнай граматыкі

Гістарычнае развіццё беларускай мовы выяўляецца пры дапамозе **параўнальна-гістарычнага метаду вывучэння моў**: вывучаючы з’явы ў мовах, якія маюць блізкую матэрыяльную роднасць (агульнасць каранёў, афіксаў), можна прыйсці да пэўных высноў аб развіцці некаторых элементаў мовы.

# Напрыклад,

параўнанне помнікаў старажытнарускай і стараславянскай  пісьменнасці, напісаных і глаголіцай, і кірыліцай, а таксама дадзеныя сучасных моў (як славянскіх, так і неславянскіх) дазваляюць высветліць гукавое значэнне літар Ѫ, Ѧ і ўстанавіць наяўнасць ў агульнаўсходнеславянскай (старажытнарускай) мове насавых галосных у розныя гістарычныя перыяды:

| Стараславянская мова | Старажытнаруская мова | Іншыя мовы |
| --- | --- | --- |
| *к@дель* | *к@дель, кудель* | фінскае *kuontalo* ‘пенька’ |
| *п#ть* | *п#ть, п"ть* | польскае *pięć* ‘пяць’ |

# 3 Сувязь дысцыпліны «Гісторыя беларускай мовы» з іншымі навукамі

- Стараславянская мова - у стараславянскай мове ўпершыню пісьмова зафіксавана славянская мова, адлюстраваны славянскія гукі і формы ў іх старажытным стане

- Сучасная беларуская мова – вынік развіцця мовы на працягу гістарычнага перыяду дзесяці стагоддзяў

- Дыялекталогія - гаворкі захоўваюць словы і формы, якія страціла літаратурная мова, некаторыя працэсы атрымалі ў дыялектах заканамернае развіццё, якога часам няма ў літаратурнай мове ў сувязі з уплывам іншых моў або па аналогіі з іншымі моўнымі з’явамі

- Гісторыя народа - народ – і творца, і носьбіт мовы, сацыяльна-палітычныя, культурна-эканамічныя падзеі, што адбываюцца ў жыцці дзяржавы, народа, адбіваюцца ў мове

- Археалогія - археалагічныя знаходкі даюць звесткі, якія дазваляюць рэканструяваць самыя старажытныя моўныя з’явы

- Анамастыка - у назвах населеных пунктаў, прозвішчах, гідронімах захаваліся, “застылі” некаторыя старажытныя моўныя з’явы: *Десна* (‘правая’), *Мыцішчы* (мыто ‘падатак’), *Бутыркі* (‘дамы ў наваколлі, якія стаяць паасобку’), *Мсціслаў, Заслаўе, Ярославль* (былыя прыналежныя прыметнікі)

- Геаграфія- узнікненне і пашырэнне моўнай з’явы на адзначанай тэрыторыі (лінгвагеаграфія)
- Этнаграфія - найменне адзення і прадметаў побыту захоўваецца са старажытнасці
- Палеаграфія - вонкавы стан рукапісных помнікаў

# 4 Асноўныя крыніцы вывучэння гісторыі беларускай мовы

- Сучасныя беларускія гаворкі і дыялекты сучасных рускай і ўкраінскай моў.
- Дадзеныя анамастыкі.

- Запазычанні ў беларускую мову з іншых славянскіх і неславянскіх моў і запазычанні з усходнеславянскіх моў (асабліва старажытнарускай) у іншыя, няроднасныя мовы:
- імя аднаго з франкскіх каралёў *Karl* змянілася, як і іншыя спалучэнні галосных з плаўнымі ў становішчы паміж зычнымі тыпу **gordъ – городъ – город - горад*, на ўсходнеславянскай глебе ў *король – кароль*;
- наяўнасць у эстонскай мове спалучэнняў *галосны + насавы зычны*, запазычаных са старажытнарускай мовы, дапамагае сцвердзіць, што ў словах тыпу *вуды* (старажытнарускае *уда*, эстонскае *und*), *суддзя* (эстонскае *sundima* ‘прымушаць’) каранёвы галосны ўзыходзіць ў старажытную эпоху, калі насавыя галосныя яшчэ існавалі.

- Разнастайныя надпісы (графіці) на званах, пячатках, упрыгожваннях, грошах, подпісы князёў.
- Помнікі старажытнай усходнеславянскай пісьменнасці. Прычым неабходна памятаць, што ў сваім узнікненні пісьменнасць мела на мэце зафіксаваць жывое вымаўленне носьбітаў мовы, але на працягу развіцця мовы пісьменнасць, кансерватыўная ў змене правіл і нормаў, адхілялася ад гэтага развіцця.